# [Лаянка]

**Нататкі:**

1. За апошнія часы „лаянка“ набыла досыць шырокую папулярнасьць, за што павінна быць удзячным двайным стараньням: дарэмным папулярызатарам з „Полы[мя]“ і „С[авецкай] Б[еларусі]“. Яна ўжо мае сваю, праўда, яшчэ не напісаную, а якая мае быць напісанай, гісторыю і тэорыю, якая ў сучасны момант распрацоўваецца, праўда, яшчэ не вядомым і не дасьвед[чаным], але маючым быць вядомым і дасьведчаным, пакуль што адзіным у гэтай вобласьці тэорэтык[ам] Гартн[ым]. Я нават больш таго думаю. Я думаю, што неўзабаве прыдуць і тэорэтыкі лаянкі, якія дасканала распрацуюць тэорыю гэтага няўміручага віду слоўнага мастацтва. Я ў гэтым пераконан. І вось чаму. Як вам ужо вядома з інф[армацыі] В[ара], «спосаб… лаянкі… „Узвышша“ абрала, як **сродак** барацьбы з… пісьменьнікамі», — паведамляе нехта Вар. А гэта–жа азначае нішто іншае, як тое, што зьявілася–ж от у людзей патрэба на лаянку. Аб гэтым дзякуючы такім дасьціпным інфарматарам, як Вар, даведзена ўжо да ведама ўсяго чытацкага грамадзтва і тым самым адкрыта магчымас[ьць] для многіх дарэмнікаў выпрабаваць свае сілы ў галіне адпаведных прадуктаў і тым самым набыць сабе славу і… (самі павінны ведаць, што за і). Але вядома, што займацца саматужным спосабам у век індустрыі — дзела зусім прапашчае. Патрэбна мэханізаваць вытворчасьць. Вось тут якраз і спатрэбяцца тэорэтыкі.

---

**Лаянка.** За апошні час гэта слова дзякуючы некаторым аматарам яго стала вельмі папулярным. Яно ўжо мае сваю гісторыю і досыць цікавую, і трэба думаць, што з часам зьявяцца яго гісторыкі і тэорэтыкі. Кажучы „тэорэтыкі“, я зусім не жартую, а гавару сур'ёзна. Бо й сапраўды, гэта слова ходзіць з вуснаў у вусны, яно красуецца амаль у кожным нумары газэты „С[авецкая] Б[еларусь]“, без яго ня можа абыйсьціся ні адзін „крытык“, які піша пра „Узвышша“, дык нічога дзіўнага ня будзе, калі ў адзін слаўны момант выступіць, скаж[ам], які тэорэтык і пачне вызначаць, што такое лаянка. Каб аблягчыць работу гэтаму адважніку і спагадаючы яму ў яго шуканьнях азначэньня, мы прапануем сьледам за народам як выходнае наступнае азначэньне. Лаянка — гэта тое–ж, што лайка, а лайка — не нагайка, на плячах не ляжыць. [(Што гэта за лайка, калі я на цябе сказаў: дурань.) (Сабака лаіць, а дваранін едзе сабе.) (Яго лаяць, а ён сьмяецца.) (Не глядзі на лаяньне сабак: пабрэшуць ды назад пойдуць.) (Лаеньне сваё сабе бяры!)] Гэта азначэньне найбольш спадручнае. Яно выключае з паняцьця „лайка“ толькі нагайку і тое, што ляжыць на плячах, а таму пры беднасьці на славесны[я] абазначэньні ці на словы для адказаў ім можна кваліфікаваць усё, што не нагайка і што не ляжыць на плячах, як гэта і практыкуюць некаторыя „кр[ытыкі]“.

*[1928]*